# ПЯТРУСЬ БРОЎКА
# І ЯГО ЧАС

Матэрыялы
Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі
(Мінск, 24 чэрвеня 2005 года)

Репозиторий БарГУ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

# ПЯТРУСЬ БРОЎКА І ЯГО ЧАС

*Матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі*
*(Мінск, 24 чэрвеня 2005 года)*

Мінск
2005

Репозиторий БарГУ

УДК 821.161.3.09(092)+929 Броўка
ББК 83.3 Беи
Б 88

**Рэдакцыйная калегія:**

*доктар філалагічных навук, прафесар,
член-карэспандэнт НАН Беларусі С. С. Лаўшук*

*доктар філалагічных навук, прафесар М. І. Мішчанчук*

*доктар філалагічных навук прафесар,
член-карэспандэнт НАН Беларусі М. І. Мушынскі*

**Адказны рэдактар**

*С. С. Лаўшук*

**Рэцэнзенты:**

*доктар філалагічных навук В. П. Жураўлёў*

*кандыдат філалагічных навук М. П. Кенька*

Зборнік склалі матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Пятрусь Броўка і яго час", якая адбылася 24 чэрвеня 2005 года ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Разлічаны на вучоных-філолагаў, аспірантаў, выкладчыкаў гуманітарнага профілю ВНУ, гімназій, ліцэяў, сярэдніх і базавых школ, на ўсіх тых, хто цікавіцца праблемамі развіцця айчыннай літаратуры.

© Інстытут літаратуры
імя Я. Купалы
НАН Беларусі, 2005

Репозиторий БарГУ

Репозиторий БарГУ

**Жанна Салдаценкава. Баранавічы**

## *ВОБРАЗ СОНЦА Ў ПАЭЗІІ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ*

"... Сонца за борам Жар-птушкай садзіцца", – гэта радкі аднаго з лепшых вершаў беларускай паэзіі "Пахне чабор" Петруся Броўкі. "Падводная плынь

верша "Пахне чабор", – сцвярджае М. Ярош, – даносіць да чытача глыбокую чалавечнасць, красу, жыццё" [9, с. 64]. Верш сведчыць аб тым, што паэт адчуваў красу і адэкватна праз пейзажна-вобразны свет яе адлюстроўваў.

Краса – адна з галоўных катэгорый класічнай эстэтыкі, якая характарызуе традыцыйныя эстэтычныя каштоўнасці, выражае адну з асноўных і найбольш распаўсюджаных форм неутылітарных суб'ектна-аб'ектных адносін, звязана з эстэтычнай асалодай, дасканаласцю, аптымальнасцю духоўна-матэрыяльнага быцця, ідэаламі, стылем. Побач з дабром і ісцінай краса – адно з старажытнейшых паняццяў культуры, багаслоўя, філасофіі [5, с. 337]. Хоць найчасцей красу нашы нацыянальныя паэты бачаць у праявах роднай прыроды, ёсць вобразы, якія можна аднесці да агульначалавечых, універсальных вобразаў, яны заключаюць у сабе архетып красы. Гэта, на нашу думку, вобраз сонца. Такое ўвасабленне красы сустракаецца ў старажытнаегіпецкай культуры, якая стала падмуркам для культуры ўсяго міжземнаморскага арэала. "Галоўным богам егіпецкага пантэона быў бог сонца Ра, таму сонечны свет выступаў сінонімам боскай красы" [5, с. 337].

Статус сонца самы высокі ў аднесенасці да скрайняга станоўчага полюса аксіялагічнай шкалы [2, с. 478]. Даследчыца айчыннай і сусветнай міфалогіі Т. Шамякіна сцвярджае: "Сонца – нябесны агонь: такі універсальны і зыходны матыў першабытнай міфалогіі літаральна ва ўсім свеце" [7, с. 69]. Як бачым, сонца – сімвал агульначалавечы, які ўвасабляе архетып красы.

Першы верш, які адкрывае "Збор твораў" ў дзевяці тамах (1987), "Ой, не шапчы, мая бярозка" быў і першым надрукаваным творам Петруся Броўкі, сведчыць аб тым, што малады паэт меў талент. "І хоць першыя вядомыя нам вершы не вызначаюцца асаблівай арыгінальнасцю мастацкага мыслення паэта, але ў іх шчырая інтанацыя, водар народна-песенных вобразаў, мелодый" [9, с. 31]. І чацвёртая страфа верша насычана словамі, якія ўвасабляюць архетып красы і шлях да яе чалавека:

*А сонца яркае устане –*

*Трава завяне у пракосах,*



Рэпазіторый БарДУ

*І я пайду па лузе босым.*

*Хай з сонцам сэрцайка спявае [4, с. 25].*

Да сонца лірычны герой ідзе босы. Праз нячутна праспяванае слова сэрца гаворыць з сонцам. Песня – адна з традыцыйных праяў нашай нацыянальнай культуры. Таму здзіўляе і захапляе паэтычны талент маладога творцы ва ўменні знаходзіць словы і формы, якія адпавядаюць агульначалавечай і нацыянальнай традыцыі. "Талент пісьменніка ў многім заключаецца ў адчуванні такога слова, якое ў найбольшай ступені актывізуе калектыўнае неўсвядомленае. У мастака больш чым у звычайных людзей, размыта мяжа паміж уласнай падсвядомасцю; у творцы наяве з'яўляецца ў мозгу тое, што іншыя людзі бачаць толькі ў сне. Правільна ўлавіўшы гук, тон, слова, пісьменнік нібыта рэалізуе грамадскія неўсвядомленыя чаканні [6, с. 212].

Цікава, што ў дадзеным вершы сонца – сімвал шчасця, да якога імкнецца герой, а шчасце – гэта Беларусь, што ўвайшла ў новую гістарычную эпоху, эпоху будаўніцтва сацыялізму, які, на думку яго стваральнікаў, і ўвасабляе грамадскія неўсвядомленыя чаканні "светлай" і "шчаслівай будучыні": "Вітаю свету новы росквіт / І Беларусь, маю красуню!"

Пятрусь Броўка быў членам літаратурна-грамадскай арганізацыі "Маладняк". Ва ўспамінах паэта гучыць згадка аб Міхасю Чароту, у ягонай паэзіі захапляла дынамічнасць, рэвалюцыйны пафас. Але, як вядома, маладнякоўцы негатыўна ставіліся да традыцыі, да нацыянальнай спадчыны. Аналізуючы дэкларацыі "Маладняка". І. Багдановіч адзначае: "Сутнасць дэкларацыі заснавана на некалькіх вузлаватых прынцыпах: 1) адмаўленне ад былой культурнай спадчыны; 2) палітычная скіраванасць, служэнне "дыктатуры пралетарыяту", будучаму камуністычнаму ладу; 3) футурыстычная фетышызацыя будучыні [1, с. 249].

На нашу думку, Пятрусь Броўка, шукаючы сябе ў паэзіі, калі і "пачынае з пачуццямі спрэчкі", то з-пад яго пяра выходзілі рытарычныя вершы, вершы-аднадзёнкі, лозунгі і агіткі. Але якраз архетыпы, сярод іх і архетып красы, якія заўсёды адлюстроўваюцца пры ўдзеле пачуццяў, вяртаюць маладога творцу да



Рэпазіторый БарДУ

класічнай традыцыі і ў плане вобразным, і плане фармальным. Маладняковец Броўка, шанаваў Янку Купалу, з якім пазнаёміўся ў 1930 годзе. Яны некалькі разоў ездзілі разам на поўдзень, правялі чэрвень 1935 года ў Ляўках, малады паэт напісаў яму верш-прысвячэнне. "Купалаўская традыцыя таксама шмат спрыяла таму, што паэт дасягнуў сэнсавай значнасці радка, трапнасці і важнасці вобраза, яго паэтычнасці, – піша М. Ярош. – У далейшым у паэзіі Броўкі захавалася аптымістычнасць светаўспрымання, прыхільнасць да масштабнага вобраза, якія так трывала замацаваўся ў творчасці Купалы, асабліва, калі паэтызавалася маладая Беларусь" [8, с. 19]. Маштабнымі вобразамі ў паэзіі Купалы лічаць зоркі, неба і сонца. "Я. Купала – вялікі санцалюб" (Алесь Бельскі), "Купала – сонцапаклоннік" (Таццяна Шамякіна). Гэты вобраз стаў для Броўкі не толькі ўвасабленнем нацыянальна-патрыятычных пачуццяў, як для Купалы, але і шчаслівай будучыні. У вершы "Янку Купалу" паўстае вобраз жалейкі, якая "клікала сонца". Калі ў Купалы сонца – сімвал шчаслівай будучыні беларускай нацыі, то для Броўкі – гэта "шчасце камуны". Такім чынам, бачым, што краса для стваральнікаў сацыялістычнай будучыні ўвасаблялася ў новым грамадстве. Узгадваецца з гэтай прычыны і утапічны твор "Горад сонца" Тамазы Кампанелы, дзе аўтар раскрывае мадэль ідэальнага чалавечага грамадства. Вобраз сонца, якое ўзыходзіць, або знаходзіцца высока ў небе, сустракаецца амаль у кожным вершы даваеннай паэзіі Броўкі: "сонцавая радасць", "сонца ўладарна ідзе па палях", "дзень высокі як сонца, шугае над ёй", "Ах, сонца, як багата твае палаюць промні" і г.д.

"Асаблівасць літаратуры XX ст. – піша Таццяна Шамякіна, – у абнаўленні глыбінных міфасінкрэтычных структур мыслення" [6, с. 212]. Абнаўляецца літаратура праз узнаўленне архетыпаў. Верш "Садоўнік" – адзін з найлепшых вершаў даваеннай пары, насычаны вобразамі-сімваламі: сонца, сад, дрэва. Адразу ўзгадваюцца, як гэта не парадаксальна для творчасці Броўкі, біблейскі Эдэм, якія стварыў Бог для шчаслівага жыцця людзей, а садоўнік і ёсць сам Бог, які "шчаслівы за працу". "Шум сакавітай зямлі", якая радуецца

жыццю, "песні сонца бярэ". Сімвал сонца ў дадзеным творы – гэта краса, без якой немагчыма адчуванне шчасця, што складаецца з гармоніі маральнага, душэўнага, духоўнага. Песні сонца – гэта душэўная краса, буянне пладоў саду – зямное, матэрыяльнае, якое прыносіць асалоду ад сузірання іх, і краса духоўная – гэта сам працэс працы, дзеяння. Сам верш, на нашу думку, гімн такой гармоніі, якая таксама з'яўляецца ўвасабленнем красы.

Такім чынам, Пятрусь Броўка праз узнаўленне сімвала сонца захоўвае беларускую паэзію ў межах традыцыі, якая ідзе з фальклору, замацавана нашымі класікамі, у прыватнасці Янкам Купалам, адчувае і па-свойму раскрывае архетып красы.

*Літаратура:*


1. *Багдановіч І.Э. Авангард і традыцыя: Бел. паэзія на хвалі нац. адраджэння. – Мн.: Бел. навука, 2001.*
2. *Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мн.: Беларусь, 2004. – 592 с.*
3. *Бельскі А.І. Свет ад травы да зор: Беларуская паэзія: сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу: Дапам. для настаўнікаў. – Мн.: Нар. асвета, 1998. – 223 с.*
4. *Броўка П. Збор твораў: у 9 т. Т. 1. Вершы, паэмы 1926 – 1941. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1987.*
5. *Новейший философский словарь: 3-е изд. – Мн.: Книжный дом. 2003. – 1280 с.*
6. *Шамякіна Т.І. Беларуская класічная літаратурная традыцыя і міфалогія. – Мн., 2001.*
7. *Шамякіна Т.І. Міфалогія Беларусі. – Мн., 2000.*
8. *Ярош М. Броўка Пятрусь: Нарыс жыцця і творчасці. – Мн.: Народная асвета, 1981. – 120 с.*
9. *Ярош М. Пятрусь Броўка / Стыль пісьменніка / Рэд. В. Барысенка, П. Дзюбайла. – Мн.: Навука і тэхніка, 1974. – С. 19 – 79.*


Репозиторий БарГУ